✓**15 красавіка** на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта адбылося ўрачыстае падвядзенне вынікаў конкурсу эсэ **«Пуцявінамі беларускага пісьменства».** Дыпломы і ўзнагароды атрымалі дзясяткі вучняў школ з розных месцаў нашай краіны. Іх уручалі арганізатары і ганаровыя госці мерапрыемства: дэкан філалагічнага факультэта БДУ кандыдат філалагічных навук Сяргей Важнік,

галоўны рэдактар часопіса «Роднае слова» Наталля Шапран, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч, дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак, намеснік генеральнага дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Віктар Пшыбытка, загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча Міхаіл Бараноўскі, доктар філалагічных навук Алесь Бельскі, доктар філалагічных навук Мікалай Прыгодзіч.